XIX Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні пройдуць 27—28 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Чытанні — адна з галоўных пляцовак для абмеркавання вынікаў навуковых даследаванняў і дасягненняў у кніжнай культуры. Мерапрыемства спрыяе наладжванню навуковага дыялогу і супрацоўніцтву паміж адмыслоўцамі розных краін, садзейнічае выпрацоўцы аптымальна эфектыўных падыходаў для вырашэння наспелых праблем ды натхняе на ўвасабленне новых праектаў.

Удзельнікі абмяркуюць такія тэмы, як рукапісная кніжнасць Беларусі; Францыск Скарына і яго паслядоўнікі — беларускія друкарні і выдаўцы XVI—XVIII стагоддзяў; 400-годдзе Куцеінскага Богаяўленскага манастыра; старадрукі XVI—XVIII стагоддзяў; гістарычныя бібліятэкі і развіццё бібліятэчнай справы Беларусі; сучасныя рэаліі кніжнай культуры.

Чытанні пройдуць у вочным і дыстанцыйным фармаце.